# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні варта задумацца пра змену прыярытэтаў. Магчыма, давядзецца рабіць тое, што вы раней не рабілі. І лепш не панікаваць, а вучыцца новаму. Не выключаны канфлікты на рабоце, таму добра было б менш мець зносін з калегамі і радзей трапляцца на вочы начальству. У канцы тыдня могуць пачаць ажыццяўляцца самыя патаемныя планы і задумы. У выхадныя з'явіцца больш вольнага часу, а справу і зносін стане значна менш.

**ЦЯЛЕЦ.** Паспех магчымы, але запатрабуе вялікіх выдаткаў сіл і часу. Прычым разлічваць можна толькі на сябе. Паспрабуйце ісці на здаровы кампраміс з дзелавымі партнёрамі і калегамі, улічыць усе інтарэсы. Тэмп работы лепш не павялічваць, а, наадварот, знізіць, калі тое будзе зручней. У асабістым жыцці рызыкуеце стаць ахвярай хлусні і ліслівасці.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вашы новыя праекты атрымаюць дадатковы штуршок, і вы яшчэ на адзін крок наблізіцеся да сваёй мэты. Няма ліха без дабра, і, што б ні адбывалася, усё акажацца на лепшае. Цікавыя ідэі і нестандартны падыход дазволяць палепшыць дабрабыт. У выхадныя варта пабыць у адзіноце ці ў акружэнні самых блізкіх людзей. Вы пераканаецеся, што вас любяць і шануюць.

**РАК.** Пачынаецца спрыяльная паласа, з'явіцца шанц для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Будуць новыя планы, перспектывы, ідэі. Натуральна, палепшыцца і настрой. Вас чакаюць прыемныя падзеі ў асабістым жыцці і ўвага супрацьлеглага полу. У пятніцу вы будзеце залішне эмацыянальныя, лепш звесці да мінімуму неабавязковыя кантакты.

**ЛЕЎ.** Панядзелак удалы для адзіноты і разважанняў, аўторак — для інтэлектуальных пошукаў. У сераду будзе шанц вырашыць чужую праблему і атрымаць шчырую падзяку. У чацвер не выключаны канфлікты ў сям'і. У асабістым жыцці магчымыя праблемы, звязаныя з моцнай занятасцю на рабоце. У нядзелю пажадана быць убаку ад падзей — у гэты дзень лепш назіраць, а не дзейнічаць.

**ДЗЕВА.** Надыходзіць складаны тыдзень, які запатрабуе хуткіх і важных рашэнняў. Імаверныя непрадбачаныя абставіны, якія пагражаюць разбурыць планы. А вось аўторак абяцае быць удалым практычна ва ўсіх адносінах — асабліва калі не пачняце рэзка і раптоўна мяняць уласныя рашэнні. У выхадныя родныя будуць чапляцца да вас з любой прычыны, паспрабуйце ўсё ж захаваць мір у сям'і.

**ШАЛІ.** На рабоце справы ідуць дастаткова добра. Магчымы поспех у фінансавых справах і ў бізнесе. Але вы не зможаце пазбавіцца ад пачуцця, што чагосьці не хапае. Асцярожней з інфармацыяй, асабліва калі яна датычыцца вас асабіста. Лепш не гаварыць лішняга. Займіце чакальную пазіцыю і дзейнічайце па магчымасці абдумана і мудра. У асабістым жыцці магчымыя расчараванні і раптоўныя перамены, аж да разводу.

**СКАРПІЁН.** Варта занняцца завязваннем больш цесных кантактаў з падначаленымі і калегамі — гэта дапаможа ўвасобіць у жыццё вашы грандыёзныя планы ў пабудове кар'еры. Вы здольныя прывабіць любога, людзі гатовыя дапамагаць і верыць. Вас чакае салідны прыбытак і нават багацце, сумленна заробленае. Да таго ж пашанцуе ў каханні — пачуеце нямала пяшчотных прызнанняў. Праводзьце больш часу ўдваіх са сваёй палавінкай.

**СТРАЛЕЦ.** Вам проста неабходна быць разумнейшымі ў дзеяннях і словах. Пошук залатой сярэдзіны наогул павінен стаць асноўным заняткам на гэтыя дні. Ніякіх лішніх фраз і необдуманых учынкаў, інакш вас чакаюць малапрыемныя наступствы. У сярэдзіне тыдня з'явіцца магчымасць кіраваць сітуацыяй, якая склалася, уплываць на падзеі найбліжэйшай будучыні. Сустрэча з сябрамі ў суботу абяцае нямала прыемных момантаў.

**КАЗЯРОГ.** Будзе няпроста ўсвядоміць, што менавіта вы робіце не так. Але без гэтага немагчыма вырашыць праблемы ні ў прафесійнай сферы, ні ў асабістым жыцці. Тое, што здавалася непахісным, цяпер можа ператварыцца ў пшык. Займацца лепш дробязямі, а таксама справамі, у якіх памыліцца немагчыма. Спрыяльныя будуць кантакты з калегамі на адлегласці, добра пройдуць нарады ў рэжыме відэаканферэнцыі. У выхадныя могуць узнікнуць складанасці ў адносінах з сябрамі — некаторыя з іх могуць павесці сябе зусім не так, як вы чакаеце.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні вырасце аб'ём работы, але выконвайце толькі тое, што па сілах. Не варта ўзвальваць на сябе лішні цяжар адказнасці. Хоць цяпер узровень вашай працаздольнасці настолькі высокі, што наваколным не ўгнацца за вамі. Паспрабуйце не навязваць сваё меркаванне, гэта можа прывесці да канфліктнай сітуацыі. У сямейным жыцці ўсё будзе не так, як хочацца, але давядзецца прыняць сітуацыю.

**РЫБЫ.** Паспрабуйце быць больш стрыманымі і не раздражняцца па дробязях. У сераду лепш не прымаць сур'ёзных рашэнняў, непажадана планаваць дзелавыя сустрэчы і перамовы. Другая палова тыдня можа быць прысвечана самаадукацыі, новай інфармацыі і змене планаў. Работа будзе адымаць шмат часу, а сямейныя справы, мяркуючы па ўсім, могуць апынуцца амаль на апошнім месцы. А дзецям між тым спатрэбіцца ваша дапамога. У выхадныя набудзьце для дома што-небудзь неабходнае, і настрой палепшыцца.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.31 | 20.43 | 15.12 |
| Віцебск — | 5.16 | 20.38 | 15.22 |
| Магілёў — | 5.21 | 20.33 | 15.12 |
| Гомель — | 5.23 | 20.24 | 15.01 |
| Гродна — | 5.47 | 20.58 | 15.11 |
| Брэст — | 5.53 | 20.53 | 15.00 |

### Месяц

*Першая квадра 30 красавіка. Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

*Пр.* Антаніны, Віктара, Георгія, Дзмітрыя, Івана, Нікіфара, Трыфана. *К.* Анатоля, Барыса.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**2 МАЯ**






**1910** год — нарадзіўся (Барысаў) Мацвей Рыгоравіч Вайнруб, генерал-лейтэнант танкавых войскаў (1968), Герой Савецкага Саюза (1945).

**1915** год — нарадзіўся (цяперашні Лепельскі раён) Іван Сямёнавіч Панцялееў, лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Ленінградскім фронце. Здзейсніў 180 баявых вылетаў, знішчыў 50 аўтамашын, чыгуначны эшалон, танк, батарэю і два батальёна пяхоты праціўніка. Зімой 1943-га, выконваючы баявое заданне, разбамбіў аўтакалону праціўніка. Калі самалёт быў падбіты, накіраваў палаючую машыну на мотакалону ворага.

**1920** год — у Мінску на беларускай мове пачаў выходзіць штотыднёвы ілюстраваны літаратурна-мастацкі часопіс «Рунь». Яго рэдагаваў Янка Купала. Часопіс асвятляў пытанні нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа, культуры і адукацыі на роднай мове, эканомікі. Спыніў існаванне 4 ліпеня гэта ж года.

**1940** год — нарадзіўся Сяргей Фядосавіч Любчук, беларускі дзеяч аматарскага мастацтва, кампазітар, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі (1978). Аўтар фантазій на тэмы беларускіх народных песень, рамансаў, песень, апрацовак і пералажэнняў для аркестра народных інструментаў і народных хароў, музыкі да спектакляў Брэсцкага абласнога тэатра лялек і іншых твораў.




**1660** год — нарадзіўся Алесандра Скарлаці, італьянскі кампазітар эпохі барока. Напісаў больш за 60 опер, лічыцца заснавальнікам неапалітанскай опернай школы.



**1900** год — нарадзіўся Сяргей Міхайлавіч Івашаў-Мусатаў, расійскі мастак. Многія гады правёў у ГУЛАГу, дзе пачаў работу над ілюстрацыямі да трагедыі «Моцарт і Сальеры», трыпціхам па творах Шэкспіра і іншымі творамі. Аляксандр Салжаніцын прысвяціў мастаку адно з найлепшых месцаў у рамане «У крузе першым».

**1910** год — нарадзіўся Максім Мангужукавіч Мунзук, акцёр, адзін з заснавальнікаў тувінскага нацыянальнага тэатра, народны артыст Расіі і Рэспублікі Тыва. Міжнароднае прызнанне прыйшло да яго пасля ролі Дэрсу Узала ў аднайменным фільме Акіры Курасавы, які заваяваў «Оскар».

**1945** год — войскі 1-га Беларускага (камандуючы Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў) і 1-га Украінскага (камандуючы Маршал Савецкага Саюза Іван Конеў) франтоў цалкам авалодалі сталіцай фашысцкай Германіі — Берлінам. Савецкімі войскамі ўзята ў палон больш за 70 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

## УСМІХНЕМСЯ

**У школе я быў апошні разгільдзяй, затое цяпер на работу на першай электрычцы езджу.**

— Прыступаем да здачы заліку!

— А падручнікамі карыстацца можна?

— Можна. Такім чынам, стаметроўка для хлопцаў — 14 секундаў, для дзяўчат — 17 секундаў.

**У мяне не вельмі шмат прынцыпаў: не працаваць пасля яды і не працаваць перад сном.**

На дурняў вырашыў зусім не крыўдзіцца. Цяпер жыву ў гармоніі з сабой.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1432.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 мая 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12